*УДК 398.332.19(4762-37Рагачоў)*

**Г. А. Асіпцова**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# АБРАД ВЫКЛІКАННЯ ДАЖДЖУ НА РАГАЧОЎШЧЫНЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА)

*У артыкуле, прысвечаным апісанню мясцовых асаблівасцей абраду выклікання дажджу, выкарыстаны аўтэнтычныя матэрыялы, запісаныя ўласна аўтарам артыкула і апублікаваныя ў зборніку “На берагах Дняпра і Друці: народная духоўная культура Рагачоўскага раёна” [1]. Прыведзеныя ў якасці прыкладаў звесткі пра абрад выклікання дажджу сведчаць пра непаўторнае рэгіянальна-лакальнае багацце традыцыйнай культуры Рагачоўскага раёна.*

Спрадвечна дождж з’яўляўся цэнтральнай тэмай у сістэме народных вераванняў розных народаў. Фальклорная спадчына Рагачоўскага раёна разнастайная і цікавая, але асаблівае месца ў ёй займае абрад выклікання дажджу. Гэта не дзіўна, таму што дождж – ключавы элемент жыцця людзей: менавіта ад яго залежаў ураджай, што наўпрост уплывала на ўзровень жыцця вяскоўцаў. Калі дажджу доўга не было або ён быў зусім дробным і нядоўгім, людзі палохаліся і звязвалі гэту з’яву са звышнатуральнымі сіламі.

Усё гэта прывяло да з’яўлення спецыяльных абрадаў, прызначаных для ўлагоджвання, паводле міфалагічных уяўленняў, прыродных духаў, каб нарэшце пайшоў дождж. Абрад выклікання дажджу ў розных мясцовасцях Беларусі мае самабытны характар, але нягледзячы на гэта можна заўважыць і агульную аснову абраднасці выклікання дажджу.

Засяродзім увагу на мясцовых асаблівасцях абраду выклікання дажджу ў Рагачоўскім раёне. Паводле ўспамінаў жыхароў вёскі Стрэнькі, адметным атрыбутам у абрадзе выклікання дажджу з’ўляліся лялькі, якія спецыяльна рабілі для ўдзелу ў гэтай абрадавай цырымоніі: “*Яшчэ ў дзяцінстве ў нас быў вясковы клуб, які цяпер ужо не працуе, дык вось, у гэты клуб мы хадзілі проста гуляць і часта рабілі лялькі, там былі цёткі, якія вучылі нас гэтаму. Гэтыя лялькі мы рабілі з саломы, адзежку ім з рыззя featureнага рабілі, усё гэта ніткамі завязвалі і прыносілі дадому, памятаю, радасныя заўсёды былі, калі трымлівалася хутка іх зрабіць. Потым маці мая ставіла ў агарод ляльку гэтую, потым яшчэ і ў дом на акно, вельмі часта дождж і пачынаўся пасля гэтага, вось*” (запісана намі ў в. Стрэнькі ад Жукавай Валянціны

Іванаўны, 1949 г. н.) .

Лічылася, што, калі людзі пачыналі капаць зямлю да Дабравешчання («Благавешчання») або гарадзіць плот, дажджу не будзе і прыйдзе засуха, таму мясцовыя жыхары ні ў якім разе не робяць гэтага, а калі хто і робіць, то суседзі і іншыя людзі лаюць за гэта і папракаюць. “*Вось, еслі да Благавешчання плот ці зямлю капаеш, то абязацельно дождж іці не будзе. Нада после Благавешчання зямлю капаць і плот гарадзіць. У нас у вёсцы такое была. Загарадзілі да Благавешчання забор – дажджа няма. Выходзілі, крычалі, маліліся, што не было дажджа. Патом узялі, павалілі гэты плот. Усё, дождж адразу пайшоў. Вот эта было. Я помню харашо*” (в. Высокае) [1, с. 265].

У некаторых вёсках у абрадзе выклікання дажджу выкарыстоўвалі ў якасці такога атрыбута хлеб, які спецыяльна рыхтавалі. Гэты хлеб-каравай, які папярэдне акраплялі пасвечанай вадой, пакідалі ў полі або каля ракі. Лічылася, што такім чынам можна задобрыць прыроду, і тады, меркавалі, што пойдзе дождж. Абрад выклікання дажджу ў в. Стрэнькі адбываўся, зыходзячы са сведчанняў інфармантаў, наступным чынам: *“Так, мы гэта рабілі вельмі часта, я як цяпер памятаю. Як толькі дажджу доўга не было, маці пастаянна клікала дапамагаць печ, каравай, ой, як жа мне гэта не падабалася ў маладосці і дзяцінстве, пастаянна пячэш, пячэш, але што-што, а дождж пачынаўся амаль адразу, недарма было тое, значыць, у дарослым узросце я перастала гэтага рабіць, але вось, як цяпер памятаю, як злавалася на гэта, потым яго яшчэі вадой пасвяцонай, якую ў бацюшкі бралі, пырскалі, але ёсць яго маці, і яна не дазваляла чаму-та, у поле выносілі і пакідалі там, яшчэ і да рэчкі, бывала, прыйдзем з ім”* (запісана намі ў в. Стрэнькі, ад Жукавай Валянціны Іванаўны, 1949 г. н.).

Паводле іншых фактычных матэрыялаў, у некаторых мясцовасцях праводзілі абворванне дарогі або ракі. На тэрыторыі Рагачоўскага раёна мела месца пераворванне вусця ракі. Лічылася, што гэтымі дзеяннямі людзі стымулююць, будзяць ад сну водную стыхію і тым самым заклікаюць дождж. Калі выконвалі абрад абворвання, то важнае магічнае значэнне надавалі зяляніне. Звычайна прыносілі галінкі дрэў, звычайна галінкі “мая”, кідалі іх у раку, у калодзежы: *“А многія жанчыны, мужчыны ( быў такі абрад) ішлі араць рэчку, значыць, прыносілі плуг, якім сеюць бульбу, і аралі, браліся: хто цянуў плуг, хто ішоў за плугам. Многа людзей ішло: хто смяяўся, хто малітву чытаў. І так працянулі ў адзін бок, у другі. Многа раз цягалі гэты плуг. Пасля плуга прыносілі ветачкі «мая», многа сабіралі і прыносілі «май», гэта ветачкі, якія ламаліся ў траецкую суботу і ўкрашваліся імі хаты ў вёсцы, вароты. Рвалі не толькі ветачкі «мая», а явар. Віселі, сохлі гэтыя ветачкі,*

*потым сабіралі іх і прыносілі, і кідалі ў рэчку, не толькі ў рэчку, і ў калодзежы кідалі, у крынічку. Хто смяяўся, дзеці смяяліся, старыя людзі сварыліся, каб, калі малітвы чыталі, слухалі, весяліліся”* (в. Залаззе) [1, с. 266].

Абрадаў, звязаных з калодзежам, вялікая колькасць. Асабліва распаўсюджаны быў абрад, калі ў калодзеж сыпалі мак. Пры гэтым чалавек, які сыпле гэты мак, павінен прыгаворваць пэўныя словы для таго, каб яго жаданне споўнілася: *“У нашай вёсцы, каб пайшоў дождж, рабілі так. Выходзілі да калодзежа, адчынялі крышку і сыпалі макавае зерне, і гаварылі: «Колькі зерня макавага, столькі даждж у будзе». І нашы мары збываліся. Тры-чатыры дні ішоў дождж”* (в. Задруцце) [1, с. 266].

У другім варыянце абраду выклікання дажджу, у якім важным прадметным атрыбутам з’яўляўся мак, удзельнічалі і дзяўчаты, у якіх павінны быць “доўгія валасы”. Адбываўся гэты абрад такім чынам: выбіраліся дзяўчаты з “доўгімі валасамі”, яны чыталі малітвы пад вечар, а астатніх адпраўлялі “даіць” мак, потым тыя праводзілі спецыяльныя дзеянні каля калодзежа: *“У нашай вёсцы, калі была засуха і не было дажджу, вось, каторыя бабкі старэнькія былі, яны ведалі такія абрады і нас пасвяшчалі ў гэтае. Яны бралі пасвяцоны мак сабе і выбіралі дзевачак такіх, з доўгімі косамі, і вось пад вечар яны чытаюць малітвы, стаяць перад іконамі, а нас адпраўляюць даіць мак, і каб трыжды праз калодзеж, нахіляліся задам, галовамі, і праз валасы сыпеш мак у калодзеж, і завеш там, выклікаеш дождж, каб пасушыў пасевы”* (Рагачоўскі раён) [1, с. 267].

Акрамя варыянтаў абраду выклікання дажджу, звязаных з нейкімі адмысловымі дзеяннямі, мелі месца і такія, якія ўключаюць у сябе толькі пэўныя славесныя прыгаворы і выкарыстоўваюцца вельмі часта тады, калі доўга няма дажджу. Гэта найбольш распаўсюджаныя абрады, таму што для іх выканання іншы раз не патрэбны былі асаблівыя дзеянні, толькі веданне асобных фраз. Звесткамі пра адзін з такіх варыянтаў абраду выклікання дажджу, звязанага са славеснымі прыгаворамі, падзялілася жыхарка вёскі Стрэнькі Зоя Іванаўна Баранава: *“І я, і мая маці, і бабка мая таксама, нават дзеці мае і ўнукі выкарыстоўвалі гэтую прымаўку. Дзеці, вядома ж, рабілі гэта жартам і па звычцы, але вось я з бабкай сваёю і мамкай клікалі дождж. Дык вось, мы казалі так: «Дождж ык, дождж ык, лупані, бабу з поля прагані, баба сядзе на лапату і паедзе далей у хату». У дзяцінстве жах як часта я яе казала, нават цяпер таксама так раблю”* (запісана намі ў в. Стрэнькі ад Баранавай Зоі Іванаўны, 1953 г. н.).

Іншы раз абрад выклікання дажджу суправаджаўся карагодам і выкананнем заклічкі, а таксама песень: *“Яшчэ памятаю, як мы*

*збіраліся вёскай усёю і пачыналі вадзіць хараводы, песні співаць ўсякія, ужо не памятаю точных слоў, але вродзе: «Дожджык, мілы, услыхай ты нас» як- та так, я точна не памятаю ўжо слоў, але такое было точна, вось памятаю гэта”* (запісана намі ў в. Стрэнькі ад Баранавай Зоі Іванаўны, 1953 г. н., студэнткай).

Прааналізаваныя варыянты абраду выклікання дажджу, як сведчаць фактычныя матэрыялы, – яскравае пацвярджэнне рэгіянальна-лакальнага багацця мясцовай традыцыйнай культуры беларусаў.

**Спіс літаратуры**

1 На берагах Дняпра і Друці: народная духоўная культура Рагачоўскага раёна / склад. і агул. рэд. В. С. Новак. – Мінск: Беларусь, 2016. – 363 с.